УДК 821.161.3–43:316

# БЕЛАРУСКІ ТРАВЕЛОГ ПРАЗ ПРЫЗМУ САЦЫЯЛАГІЧНЫХ КАНЦЭПЦЫЙ

**Новік Ганна Юр'еўна**
аспірант Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы
(г. Мінск, Беларусь)

Травелог існуе як вынік інтэрферэнцыі літаратурнага, геаграфічнага, гістарычнага, этналагічнага дыскурсаў. Гэта робіць яго крыніцай каштоўнай



…й архив библиотеки МГУ имени А…

інфармацыі і павялічвае колькасць падыходаў, прымяняльных пры разглядзе падарожных нататак. Пачынаючы з 70-х гг. XX стагоддзя такія творы ўсё часцей разглядаліся ў рэчышчы сацыялогіі, што дазволіла даследчыкам сканцэнтраваць увагу на асобе аўтара травелога, яго прыярытэтах, матывацыі і асабліва мэтах вандроўкі.

Адна з першых спробаў класіфікацыі падарожных нататак належыць ізраільскаму сацыёлагу Э. Коўэну, які ў рабоце "A Phenomenology of Tourist Experiences" сцвярджаў, што "любое вандраванне па-за межамі звыклага абсягу прадугледжвае, што ёсць пэўны вопыт, дасяжны «там» <…> і які робіць жыццё вартым" [1, с. 93]. У залежнасці ад пастаўленых вандроўнікам мэтаў – баўленне часу, уцёкі ад штодзённай руціны, пошук новых ці страчаных сэнсаў, пілігрымства – навукоўца вылучыў пяць тыпаў падарожнікаў: "рэкрэацыйны", "шукальнік зменаў", "шукальнік вопыту", "эксперыментатар" і "экзістэнцыяніст" адпаведна. Такая канцэпцыя аказалася даволі жыццястойкай і неўзабаве атрымала развіццё ў кнізе французскага семіётыка Ц. Тодарава "On Human Diversity. Nationalism, Racism and Exocism in French Thought", які прапанаваў, абраўшы ў якасці галоўнага крытэру характар суадносін з абарыгенамі, вылучаць дзесяць разнавіднасцяў вандроўнікаў, а менавіта "асімілятар", "шукальнік карысці", "турыст", "імпрэсіяніст", "асімілянт", "выгнанец", "экзотык", "алегарыст", "расчараваны" і "філосаф". Брытанскі сацыёлаг З. Бауман ("Ponowoczesne wzory osobowe") звузіў колькасць такіх тыпаў да пяці: "паломнік", "фланер", "валацуга", "турыст", "гулец", прызнаючы, што яны паслядоўна змяняюць адзін аднаго, аднак пры гэтым функцыянуюць як раўнавартасныя і могуць узаемаперасякацца.

Згаданыя тэорыі аб'яднаныя паміж сабой усведамленнем множнасці іпастасей вандроўніка, схільнасцю надаваць чалавечым адносінам пераразрыўнасць і фрагментарнасць, паколькі, словамі З. Баумана, усе яны не прызнаюць "«звязваючых путаў» і доўгачасовых уплываў, перашкаджаюць складванню ўстойлівых сетак узаемных абавязальніцтваў і абавязкаў" [2, с. 137]. Гэтаму пункту гледжання супрацьпастаўлена меркаванне амерыканскага навукоўцы Д. МакКанэла, які ў даследаванні "The Tourist. A new Theory" вызначыў у якасці метафары сучаснага чалавека фігуру не вандроўніка, але турыста, чые перамяшчэнні больш упарадкаваныя і не вядуць да адкрыццяў чаго-небудзь новага. Такія абагульненні, безумоўна, маюць рацыю, сведчаннем чаму з'яўляецца мноства сучасных турыстычных блогаў, падобных адзін да другога, фотарэпартажаў і іншых вынікаў масавага перамяшчэння па загадзя спланаваных маршрутах. Аднак для аналізу паўнавартасных травелогаў больш прымяняльныя ідэі Ц. Тодарава, якія дазваляюць дакладна вызначыць тып вандроўніка і адпаведна спосаб яго



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

камунікацыі з чужародным асяродкам. Разам з тым адзначым, што існаванне ўніверсальнай тыпалогіі падарожніка для літаратур усіх краін падаецца малаверагодным, таму для травелогаў беларускай літаратуры прапануем наступную.

Першым тыпам аўтара ў гісторыі падарожных нататак на нашых землях з'яўляецца **паломнік**. Фрагмент такога вобраза прадстаўлены ўжо ў XII стагоддзі ў "Жыціі Ефрасінні Полацкай", каб грунтоўна ўсталявацца ў XVI–XVII стагоддзях у творах "Перагрынацыя" М. К. Радзівіла (1582 г.), "Апалогія перагрынацыі" М. Сматрыцкага (1628 г.), і "Дыярыўшы" А. Філіповіча (1646 г.). Рэлігійныя мэты ў пералічаных тэкстах відавочна саступаюць месца філасофскім, культурніцкім і ідэалагічным, адпаведна пратаганіст выяўлены як асоба сацыяльна актыўная і значная.

Другі тып – **этнограф** – з'яўляецца ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Першапачаткова мэты зацікаўленасці аўтараў гісторыяй роднага краю насілі выключна навуковы характар, як, напрыклад, у "Вандроўках па маіх былых ваколіцах" (1853 г.) У. Сыракомлі ці "Путешествии по Полесью и белорусскому краю" (1858 г.) П. Шпілеўскага. Аднак на пачатку XIX стагоддзя адбылася аберацыя ў бок апісання паўсядзённага побыту насельніцтва з розных мясцін беларускай зямлі ці параўнання з побытам іншых народаў. Сведчаннем таму – "З дарогі" (1908 г.) Цёткі, "Лісты з дарогі" (1910 г.) Ядвігіна Ш., "Дзесяць дзён падарожжа па Беларусі" (1925 г.) З. Бядулі, "Падарожжа на новую зямлю" (1928 г.) М. Зарэцкага. Краязнаўча-патрыятычны пафас уласцівы і асобным творам ІІ паловы XX стагоддзя, такім, як "Паэма дарог" (1961 г.) А. Клышкі і Я. Сіпакова, "Зямля маіх продкаў" (1963 г.) Б. Сачанкі і "Званы ў прадонні азёр" (1969 г.) У. Караткевіча.

Наступную разнавіднасць вандроўніка можна пазначыць як **дзейную асобу**, паколькі такія нататкі ўяўляюць сабой не проста травелог, але апісанне вандроўкі, здзейсненай у прафесійных мэтах. "Уражанні ад паездкі ў Беларускую Радавую Сацыялістычную рэспубліку" (1927 г.) В. Ластоўскага або "Відагоршчы" (1930 г.) С. Знаёмага асвятляюць моманты Акадэмічнай канферэнцыі Інбелкульта ў Мінску і пахода Чырвонай арміі з мэтай калектывізацыі адпаведна, дазваляючы чытачу зірнуць на гэтыя падзеі вачамі актыўнага ўдзельніка.

Чацвёрты тып увасабляе **турыста** – шукальніка вопыту – і з'яўляецца найбольш распаўсюджаным сярод беларускай падарожнай нарысістыкі. Пошукі новых сэнсаў у такіх нарысах адбываюцца дзякуючы знаёмству аўтара з замежнай краінай, з іншым укладам жыцця, які не ўяўляецца неабходным для пераймання, аднак выклікае пэўнае здзіўленне і жаданне падзяліцца ўражаннямі з чытачом. Сюды можна аднесці "Ад Дуная да Ядрана" (1956 г.) П. Панчанкі, "Тыдзень на Украіне" (1957 г.) Я. Скрыгана, "Польскі дзённік" (1955 г.), "На тым баку планеты" (1960 г.) і "Душа – не падарожніца" (1962



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

г.) Я. Брыля, “За акіянам” (1980 г.) М. Лынькова, “Лісты з Амерыкі” (1980 г.) А. Кудраўца, “Палын і васілёк” (1984 г.), “Сум па Бранкавіцкім коле” і “Ліёнскі тыдзень” (1990–93 гг.) С. Законнікава, “Рымскі дзённік” (1987 г.) А. Мальдзіса, “Дзесяць дзён другога адкрыцця” (1988 г.) В. Зуёнка і інш.

На працягу 90-х гг. ХХ стагоддзя сфарміраваўся пяты тып вандроўніка – **філосаф**. Да гэтай катэгорыі мы адносім героя падарожных нататак А. Глобуса “Сшыткі” (2004 г.). Такі тыпаж выкарыстоўвае ў якасці імпульсу для сваіх разважанняў толькі асобныя рэчы ці з’явы, не звяртаючыся да стварэння цэласнага вобразу наведанай краіны. Пры гэтым не адбываецца параўнання між сабой вобразаў з розных мясцін, гэтаксама як і супастаўлення іх з заўважанымі на радзіме. **Літаратурацэнтрычны** тып уяўляе сабой падарожніка, маршрут чыйго перамяшчэння ахоплівае мясціны, звязаныя з жыццёвым і творчым шляхам пэўнага пісьменніка або яго персанажаў. Яскравы прыклад такіх вандроўных запісаў – “Камяні тых сядзібаў” (2004 г.) К. Цвіркі, дзе аўтар падарожнічае па слядах А. Міцкевіча, Я. Чачота, Т. Зана, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі і іншых знакавых постацяў айчыннага прыгожага пісьменства. Звычайна адзначаны тып спалучае ў сабе рысы паломніка і этнографа.

Сёмую разнавіднасць выявім як **алегарыста**, які выкарыстоўвае набыты падчас вандроўкі па замежжы вопыт з мэтай расповеду пра сваю родную краіну. Так, у “Настальгіі” (2014 г.) С. Абламейкі аўтар праводзіць пэўныя паралелі між краінай свайго пражывання і Беларуссю. Выяўленая розніца падштурхоўвае пісьменніка да паглыблення ў гісторыю. Апошні тып вандроўніка – **сінтэтычны**, паколькі спектр мэтаў даволі разнастайны. Тут аўтар не толькі спрабуе ўцекчы ад руціны, вынайсці новыя сэнсы, цікава прабавіць час, але і ажыццяўляе падарожжа ўглыб сябе, адштурхоўваючыся ад праяваў чужых культур. Найбольш яркі ўзор выяўлены ў творах “Рома едзе. Кніга 1” (2014 г.) і “Рома едзе. Кніга 2” (2015 г.) Р. Свечнікава.

Такім чынам, разгляд беларускіх падарожных нататак праз прызму сацыялагічных канцэпцый дазваляе дыферэнцыяваць іх у адпаведнасці з тыпам вандроўніка на восем разнавіднасцяў. Нарацыя ў травелогах можа адбывацца з пункту гледжанння паломніка, этнографа, дзейнай асобы, турыста, філосафа, алегарыста, а таксама вандроўнікаў літаратурацэнтрычнага і сінтэтычнага тыпаў.

### Літаратура


1. Cohen, E. A Phenomenology of Tourist Experiences / Erik Cohen // The Sociology of Tourism: Theoretical and Empirical Investigations. – Abingdon: PsychologyPress, 1996. – P. 92–114.
2. Бауман, З. От паломника к туристу / З. Бауман // Социологический журнал, 1995. – № 4. – С. 133–154.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова